***Ад тэорыі да практыкі.*** Складзіце спіс аб'ектаў, якія вы хацелі б наведаць у такіх гарадах вобласці, як Жодзіна, Слуцк, Вілейка.

## § 49. Горад Мінск

***Успомніце.*** *Якія функцыі выконвае звычайна сталічны горад?*

**1. Роля горада ў гаспадарцы краіны.** Удзельная вага валавога рэгіянальнага прадукту Мінска ў фарміраванні ВУП краіны складае 30,3 %. Гэта найбуйнейшы цэнтр прамысловасці і сферы паслуг. Па велічыні ВРП пераўзыходзіць усе вобласці краіны. У структуры ВРП пераважае сфера паслуг (мал. 157).




Мал. 157. ВРП г. Мінска, 2023 г., %

Горад Мінск па ўдзельнай вазе ў агульнарэспубліканскім аб'ёме прамысловай вытворчасці знаходзіцца на трэцім месцы (мал. 145, *а*).

По карце атласа (с. 83) вызначце ўдзельную вагу Мінска ў колькасці насельніцтва Беларусі.

**2. Геаграфічнае становішча.** Мінск з'яўляецца галоўным палітычным, прамысловым, навуковым і культурным цэнтрам краіны, найбуйнейшым транспартным і тэлекамунікацыйным вузлом.

У Мінску знаходзяцца Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урад краіны, дыпламатычныя прадстаўніцтвы, каардынуючыя органы СНД.

Упершыню горад згадваецца ў летапісе ў 1067 г. Размяшчаецца недалёка ад геаграфічнага цэнтра Беларусі ў межах Мінскага ўзвышша на рацэ Свіслач. Займае тэрыторыю плошчай 354 км$^2$. Горад падзяляецца

на дзевяць адміністрацыйных раёнаў. Цэнтральнае становішча горада на скрыжаванні магістральных дарог абумовіла выгаднасць геаграфічнага становішча.

**3. Насельніцтва.** Насельніцтва сталіцы — 1992,7 тыс. чалавек, што складае амаль 22 % насельніцтва краіны. Мінск займае першае месца па колькасці насельніцтва сярод адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак і гарадоў краіны. Натуральны прырост насельніцтва складае каля 3,0 ‰. Паводле нацыянальнага складу пераважаюць беларусы (каля 87 %), другое месца займаюць рускія (7 %). Прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей складаюць каля 3 %.

**4. Прамысловасць.** У Мінску самая вялікая колькасць прамысловых прадпрыемстваў — больш за 4500. У структуры апрацоўчай прамысловасці вядучую ролю адыгрывае машынабудаванне.

У Мінску вырабляюцца аўтобусы, тралейбусы, электробусы, грузавыя аўтамабілі, веласіпеды і матацыклы, трактары, машыны для камунальнай гаспадаркі, станкі, тэхналагічнае абсталяванне.

Мінскі аўтамабільны завод (МАЗ) выпрабляе грузавыя аўтамабілі, шасі для пажарных машын, спецыяльную тэхніку для выканання пагрузачна-разгрузачных і будаўніча-мантажных работ. Грузавікі МАЗ можна ўбачыць на прэстыжных аўтагонках.

Назавіце прадпрыемствы, якія вырабляюць прадукцыю машынабудавання ў Мінску.

Мінск з'яўляецца лідарам у краіне па вытворчасці электраабсталявання: халадзільнікаў і маразільнікаў, пральных машын, тэлевізараў, інтэгральных схем, гадзіннікаў, медыцынскай тэхнікі, бытавой апаратуры.

У апрацоўчай прамысловасці горада даволі высокая ўдзельная вага прадукцыі хімічнай прамысловасці. Вырабляюцца пластмаса і пластмасавыя вырабы, лакі і фарбы, мыйныя сродкі, лекі, парфумерыя. Па ўдзельнай вазе ў апрацоўчай прамысловасці Мінска харчовая прамысловасць займае трэцяе месца. Працуюць прадпрыемствы па вытворчасці мяса і мясных вырабаў, малака і малочных прадуктаў, цукерак, мінеральнай вады і інш.

Успомніце прадпрыемствы па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў, размешчаныя ў Мінску.

Сярод лідараў Мінск і па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў і керамічных вырабаў.

«Керамін» вырабляе керамічную плітку высокай якасці, якая карыстаецца вялікім попытам на айчынным і замежных рынках. У 2024 г. на прадпрыемстве распрацавалі дызайн керамічнай пліткі з дапамогай штучнага інтэлекту.

Вылучаецца Мінск і па вытворчасці драўляных будаўнічых канструкцый, мэблі, шпалер. Ён лідзіруе ў краіне па выпуску ваўняных тканін, адзення, абутку, сумак і іншых вырабаў.

У рамках рэалізацыі дзяржаўнай праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» горад Мінск у 2025 г. цалкам пераведзены на водазабеспячэнне артэзіянскай вадой.

Удзельная вага вытворчасці і размеркавання электраэнергіі і газу складае больш за 18 %. У горадзе функцыянуюць тры ЦЭЦ, якія выпрацоўваюць электраэнергію і забяспечваюць цяплом насельніцтва горада.

**5. Геаграфія сферы паслуг.** У Мінску развіты ўсе віды эканамічнай дзейнасці, якія адносяцца да сферы паслуг. У апошнія гады істотна вырасла доля тэлекамунікацый і сувязі (16 %). Паспяхова функцыянуе Парк высокіх тэхналогій.

Каля 15 % ВРП прыпадае на гандаль, рамонт аўтамабіляў і бытавых вырабаў. Доля транспарту і сувязі ў ВРП Мінска складае 5 %. Гэта адзін з найбуйнейшых цэнтраў фарміравання грузаў у краіне. Вядучую ролю ў перавозках грузаў адыгрывае аўтамабільны і чыгуначны транспарт. Па пасажыраабароце ўдзельная вага Мінска толькі крыху саступае сумарнаму паказчыку ўсіх абласцей. Мінск з'яўляецца асноўным цэнтрам авіяперавозак у краіне, якія ажыццяўляюцца з Нацыянальнага аэрапорта «Мінск». Вялікі аб'ём перавозкі пасажыраў прыпадае на метрапалітэн.

У Мінску развіты грамадскі сектар сферы паслуг, які ўключае ахову здароўя, адукацыю, установы культуры, турызму і адпачынку. У горадзе функцыянуюць РНПЦ па розных кірунках. Мінск характарызуецца высокім узроўнем развіцця сістэмы адукацыі. У горадзе пятая частка ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі і больш за палову УВА. Мінск — найбуйнейшы цэнтр навукі і інавацый. Тут знаходзіцца большасць навукова-даследчых інстытутаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, шмат ведамасных навукова-праектных інстытутаў.

Прааналізуйце карты атласа (с. 61–71) і растлумачце, чаму такая вялікая колькасць устаноў адукацыі знаходзіцца ў Мінску. Назавіце ўстановы вышэйшай адукацыі Мінска.

У горадзе функцыянуе вялікая колькасць устаноў культуры: 45 бібліятэк, 11 музеяў, 11 тэатраў, цырк, заапарк.

Візітнымі карткамі Мінска з'яўляюцца манумент Перамогі, ратуша, Траецкае прадмесце, праваслаўны Свята-Духаў кафедральны сабор і каталіцкі кафедральны касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі, праваслаўны храм-помнік у гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, якія выратаванню нашай Айчыны паслужылі. Па колькасці наведванняў вылучаюцца Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Сапраўдным упрыгажэннем горада стаў будынак Нацыянальнай бібліятэкі.

Мінск — найбуйнейшы ў краіне цэнтр турызму і адпачынку міжнароднага значэння.

Тут дзейнічае каля 3900 спартыўных збудаванняў. Сярод іх адзін з найбуйнейшых у Еўропе комплекс «Мінск-арэна», Нацыянальны футбольны стадыён (мал. 158), лядовы палац «Чыжоўка-Арэна», Нацыянальны алімпійскі стадыён «Дынама».

**6. Знешнеэканамічныя сувязі.** Доля Мінска ў знешнегандлёвым абароце рэспублікі складае 31 %. Арганізацыі Мінска пастаўляюць на знешні рынак прадукцыю, выраблену як у горадзе, так і ў іншых рэгіёнах рэспублікі. Найперш гэта трактары, тэлевізары, нафтапрадукты, грузавыя



*а*



*б*

Мал. 158. Спартыўныя аб'екты Мінска:
*а* — «Мінск-арэна»; *б* — Нацыянальны футбольны стадыён

аўтамабілі, аўтобусы, трансфарматары электрычныя, пральныя машыны, халадзільнікі і маразільнікі.

**Падвядзём вынікі.** Мінск займае першае месца па колькасці насельніцтва сярод гарадоў краіны. Гэта вядучы цэнтр па вытворчасці трактароў, аўтобусаў, тралейбусаў, халадзільнікаў, пральных машын, інтэгральных схем, тэлевізараў, керамічнай пліткі, ваўняных тканін. Сфера паслуг перавышае 70 % у структуры ВРП горада.

***Праверце сябе.*** 1. У чым асаблівасці насельніцтва горада Мінска? 2. Назавіце галіны спецыялізацыі прамысловасці Мінска.

***Праблемныя пытанні.*** 1. Чаму асноўнай галіной спецыялізацыі Мінска з'яўляецца машынабудаванне? 2. Чаму ў Мінску высокая доля сферы паслуг у ВРП?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Вам прапанавалі выступіць на канферэнцыі. Падрыхтуйце стэндавы даклад «Мінск — найбуйнейшы цэнтр адукацыі і навукі».

## § 50. Магілёўская вобласць

***Успомніце.*** *Як уплываюць на прыродныя рэсурсы лёсападобныя адклады?*

**1. Роля вобласці ў гаспадарцы краіны.** Удзельная вага валавога рэгіянальнага прадукту Магілёўскай вобласці ў фарміраванні ВУП краіны самая нізкая і складае 7,6 % (гл. мал. 144). Магілёўская вобласць па ўдзельнай вазе ў агульнарэспубліканскім аб'ёме прамысловай вытворчасці знаходзіцца на сёмым месцы, а па вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі — на шостым (гл. мал. 145).

Па карце атласа (с. 81) вызначце ўдзельную вагу вобласці ў колькасці насельніцтва Беларусі.

**2. Геаграфічнае становішча вобласці.** Магілёўская вобласць размяшчаецца на ўсходзе Беларусі і мяжуе з Расіяй. У яе межах знаходзіцца крайні ўсходні пункт краіны. Па плошчы (29,1 тыс. км$^2$) яна пераўзыходзіць толькі Гродзенскую вобласць.

**3. Прыродныя рэсурсы.** Магілёўская вобласць характарызуецца разнастайнымі мінеральнымі рэсурсамі. Найбольшае значэнне маюць радовішчы мелу і мергелю, на базе якіх працуюць цэментныя заводы ў Крычаве і Касцюковічах. Да мелавых адкладаў прымеркаваны